*С.У. Гулідаў*
ГДУ імя Ф. Скарыны (Гомель)

# НАРМАТЫЎНЫ І АЦЭНАЧНЫ МЕТАДЫ АНАЛІЗУ ЛІКВІДНАСЦІ БАНКА

Асновай дзейнасці любога банка з'яўляецца прыцягненне грашовых сродкаў кліентаў і іх размяшчэнне ў актывы. Пры гэтым банкі прымаюць на сябе шматлікія і часам супярэчлівыя абавязацельствы. Адно з іх — ліквіднасць. Банк лічыцца ліквідным да таго часу, пакуль своечасова і ў поўным аб'ёме выконвае свае абавязацельствы па захаванасці грашовых сродкаў кліентаў, а таксама іх даручэнні па плацяжах, заяўкі па адкрыццю і абслугоўванню крэдытных ліній.

У сучаснай эканамічнай літаратуры і банкаўскай практыцы няма адзінай трактоўкі паняцця ліквіднасці. Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца вызначэнне ліквіднасці як здольнасці банкаў забяспечваць своечасовае выкананне сваіх абавязацельстваў. Такое ж вызначэнне даецца і ў Інструкцыі аб эканамічных нарматывах для банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, распрацаванай Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

Згодна з дадзенай Інструкцыяй устанаўліваюцца нарматывы ліквіднасці: імгненная, бягучая, кароткатэрміновая, мінімальныя суадносіны ліквідных і сумарных актываў.

Прымяненне прудэнцыяльных нарматываў мае такія станоўчыя бакі, як аб'ектыўнасць, універсальнасць, супараўнальнасць. Асноўным недахопам устанаўлення абавязковых патрабаванняў ліквіднасці з'яўляецца тое, што адзіныя нарматывы не могуць улічваць індывідуальныя асаблівасці банкаў.

Аналіз ліквіднасці можа ажыццяўляцца з дапамогай ацэначных паказчыкаў, якія разлічваюцца на падставе даных балансу і іншай інфармацыі: пакрыццё капіталам альбо ліквіднымі актывамі, канцэнтрацыя трэбаванняў і абавязацельстваў, аналітычныя паказчыкі ліквіднасці. Аднак трэба зазначыць, што большасць беларускіх банкаў абыходзіцца ацэнкай ліквіднасці толькі на падставе разліку нарматываў, якія ўстанаўліваюцца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

Назіраюцца агульныя тэндэнцыі ў змяненні прудэнцыяльных патрабаванняў ліквіднасці:

- скарачэнне часовага гарызонта рэгулявання і кантролю ліквіднасці банкаў органам банкаўскага нагляду;
- пераход ад устанаўлення абавязковых нарматываў да кантролю якасці кіравання банкамі ўласнай ліквіднасцю і назірання дынамікі змяненняў трэбаванняў і абавязацельстваў банка;
- магчымасць прымянення індывідуальнага падыходу да банкаў.

Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by